**Грамадчанка Т.К. (Мінск)**

## Катэгорыя прыгожага ў эстэтычнай сістэме Максіма Багдановіча

У літаратуразнаўстве існуюць два блізкія, аднак, не сінанімічныя паняцці – п р ы г о ж а е і п р ы г а ж о с ц ь (прекрасное и красота). Апошняя, хоць таксама з’яўляецца адной з важнейшых катэгорый эстэтыкі, выступае паняццем больш вузкім, яна раскрывае і ацэньвае асобныя бакі эстэтычных вартасцей канкрэтных прадметаў і з’яў рэчаіснасці.

М. Багдановіч шырока выкарыстоўваў у творчасці слова *к р а с а*, напаўняючы яго разнастайным і складаным зместам: «краса жывая», «краса радзімая», «краса даўняя», «цвятоў расістых чыстая краса», «двайной красы аблік ядыны», «прад высокаю красою» і інш. Слова *п р ы г о ж ы*, якое таксама сустракаецца ў паэзіі і прозе пісьменніка («узор прыгожы пекных зор», «радкі кірыліцы прыгожай», «прыгожы, лёгкі пыл»), адназначнае, яно нясе агульную, часам знешнюю і не заўжды сутнасную характарыстыку ўзноўленай рэчы ці прыроднай з’явы. Так, у вершы «Перапісчык» яно служыць для паказу абставін, у якіх манах «на чыстым аркушы» няспешна выводзіць пяром літары і, дэманструючы сваё ўмельства, аздабляе іх «усякімі цвятамі, / Рознакалёрнымі галоўкамі звяроў / І птах нявіданых...» [1, с. 88]. «Тут усё прыгожае, і тое, што ствараецца перапісчыкам, і тое, што яго акружае...» [6, с. 492], – адзначала Т. Чабан.

Даследчыкі творчасці М. Багдановіча даўно заўважылі, што цыкл «Старая Беларусь» адкрываюць вершы-спарышы, якія характарызуюць адну і тую ж з’яву – стварэнне старажытных летапісаў – з розных бакоў. У першым вершы («Летапісец») эпітэт *прыгожы*, а таксама апісанне працы манаха, якое б сведчыла пра цікавасць стваральніка летапісу да прыгажосці адсутнічаюць. «Прыгожы труд» перапісчыка (другі верш) аздабляе, надаючы эстэтычную вартасць «няхітраму пісанню» летапісца, які імкнуўся занатаваць «ўсю праўду пра жыццё у наш і прошлы час» [1, с. 86]. Слова *прыгожы* з’яўляецца ў наступным, трэцім па ліку, творы цыкла («Кніга»). Гэтым эпітэтам характарызуецца выгляд тэксту Псалтыра: радкоў кірыліцы, дбайна і па-майстэрску апрацаваных перапісчыкам, у гармоніі з імі – «няжорсткая бурая кожа» і «срэбныя засцёжкі» на вокладцы. У дадзеным выпадку знешняя, убачаная прыгажосць выступае часткай больш складанай, што ўбірае як форму, так і змест прачытанага ў кнізе. «Псальму слічную» лірычны герой называе «к р а с о й ж ы в о й» (вылучана намі. – *Т. Г.*), бо выяўленая ў ёй у сціслай арыгінальнай форме думка напаўняе радасцю душу. Згадка пра «няхітрую прыпіску», што пакінуў перапісчык Псалтыра, выводзіць на разуменне прыгожага як спажытку душы, аб чым М. Багдановіч сказаў у «Апокрыфе». Дзяк Гапон гэту кнігу «д з е л я д у ш ы (вылучана намі. – *Т. Г.*) спісаў у месцы Ваўкавыску» [1, с. 89].

Адрозненні ў сутнасным напаўненні М. Багдановічам паняццяў *прыгажосць* і *краса* выразна бачны ў тэксце «Апавядання аб іконніку і залатару...». Залатар Корж, адстойваючы выяўленае ў форме ўмельства майстра, гаворыць: «...Прызнаць мы мусім, што каштоўнасць вырабаў прыгожых адно толькі праз красу іх форм узрастае і толькі красою форм каштоўнасць тую мераць можна» [2, с. 63]. Тут за эпітэтам *прыгожы* стаіць знешні (ён адразу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кідаецца ў вочы) выгляд іконы, напісанай па існуючых канонах і правілах, таму бязлікай і скіраванай толькі на хрысціянскую праблему «збаўлення душы сваёй». Краса ж у апавяданні звязваецца з чымсьці больш істотным – з *каштоўнасцю* рэчы, якая вымяраецца аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі адносінамі, ацэньваецца праз эмацыянальнае ўспрыманне чалавека, выклікае ў яго душы гаму пачуццяў, зразумела, не выключаючы і рэлігійныя.

Гэтыя і іншыя прыклады даюць падставу сцвярджаць, што паняцце к р а с а М. Багдановіч ужываў пераважна ў значэнні агульнаэстэтычнай катэгорыі п р ы г о ж а г а. Частотнасць яго ўжывання (толькі ў творах з кнігі «Вянок» звыш дзесяці разоў), а таксама шматлікасць аб'ектаў і выяў рэчаіснасці, у якіх пісьменнік бачыў красу, сведчаць пра цэнтральнае месца прыгожага ў мастацкай сістэме творцы.

«Песняром чыстае красы» назваў А. Луцкевіч аўтара «Вянка» адразу пасля выхаду кнігі. Вызначэнне сустрэла, як пазней адзначыў крытык, «агульнае прызнанне і перайшло ў гісторыю беларускае адраджэнскае літаратуры <...> бо ніводзін з беларускіх паэтаў не выявіў такой свядомасці у шуканні КРАСЫ, не выявіў такога шчырага пакланення ёй, як Максім Багдановіч» [5, с. 16]. Гэта ж падкрэсліў у «Гісторыі беларускае літаратуры» яшчэ адзін сучаснік Багдановіча М. Гарэцкі: «Мыслячы, ён усюды шукае красу, хараство, гармонію». І далей: «Калі ж у каторым небудзь вершыку свае асобнае ідэі няма, дык для яго астаецца адна агульная ідэя ўсіх вершаў: с в е т п р ы г о ж, і а д ч у в а ц ь я г о х а р а с т в о – ш ч а с ц е ж ы ц ц я (вылучана аўтарам. – *Т.Г.*)» [3, с. 347]. Дадзеную характарыстыку, крыху канкрэтызаваўшы яе, па сутнасці паўтарыў напрыканцы XX ст. В. Івашын: «Здольнасць бачыць жыццё праз прызму хараства, адкрываць яго ў рэчаіснасці праходзіць як лейтматыў праз усю творчасць паэта. Краса становіцца ўнутранай тэмай, прадметам роздуму, паэтычнага перажывання, найвялікшай духоўнай каштоўнасцю, маральна-эстэтычным ідэалам...» [4, с. 234–235].

М. Багдановіч не толькі шукаў і апяваў прыгожае, але і імкнуўся асэнсаваць яго як з'яву. Схільны да пытанняў агульназначных, ён у шэрагу вершаў («Рандо» («Узор прыгожы пекных зор…»), «Санет» («На цёмнай гладзі сонных луж балота...»), «Свяча бліскучая зіяе...», інш.) зрабіў красу прадметам філасофскага роздуму. Так, у «Рандо» («Узор прыгожы пекных зор…») паўстае краса сапраўдная і адлюстраваная, сурагатная: «узор прыгожых пекных зор» на небе і яго адбітак у «вадзе балот, стаўкоў, азёр». Мэта пісьменніка, аднак, не ў тым, каб іх проста супрацьпаставіць. Бачны ноччу на зямлі «гарашчы міла / Узор» таксама з'яўляецца прыгожым відовішчам. Сам па сабе ён не прэтэндуе на першынство, сапраўдным яго лічаць жабы, якія не хочуць ці не могуць глядзець на зорнае неба. Жабы не толькі задавальняюцца адбіткам, яны клянуць сонца, «што скрыла / Луж зоры днём» [1, с. 141]. У творы, такім чынам, уздымаецца праблема адносін да прыгожага, разумення яго сапраўднай сутнасці.

Прыгожае ў М. Багдановіча не паўстае адарваным ад паўсядзённай рэчаіснасці. *Васількі* і *каласы* (апавяданне «Апокрыф») растуць побач, радуючы вочы і душу чалавека. «Страніца лепшая ў штодзённіку жыцця» для героя-апавядальніка («У вёсцы») – успамін пра «цененькую», «упэцканую»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзяўчынку, што, як клапатлівая маці, схілілася над спалоханым брацікам. У гэтую хвіліну дзяўчынка «была аж да краёў паўна / Якойсь шырокаю, радзімаю красою» [1, с. 145]. Па Багдановічу жыццё дэманструе нават парадаксальнае суіснаванне прыгожага і агіднага: бялюткія лілеі закрасавалі сярод бруду і плесені балота («Санет» («На цёмнай гладзі сонных луж балота…»)). Топкае багно «Гніль сотні год збіраючы... / Смуроднай жыжкаю узгадавала / Цвятоў расістых чыстую красу» [1, с. 138]. Асяроддзе, у якім нарадзілася краса, толькі падкрэслівае яе чысціню «за снег нябеснай вышыні бялей». Яна сапраўдная, таму павінна жыць і радаваць сваім існаваннем. Гэтую думку нясуць заключныя радкі твора: «Маліся ж, каб з літоўнасці стрымала / Тут смерць сваю нязвонкую касу» [1, с. 138].

Вершы М. Багдановіча, у якіх асэнсоўваецца тэма хараства ў жыцці і мастацтве, Т. Чабан назвала своеасаблівым «вечам», бо яны «гавораць, спрачаюцца між сабой», у іх «думка паварочваецца рознымі гранямі» [6, с. 505]. Ці можа прыгажосць быць жорсткай, бяздушнай? Зместам верша «Свяча бліскучая зіяе...» М. Багдановіч дае адказ на гэтае пытанне. Твор пабудаваны на рэзкім кантрасце: бліскучая свечка, якая сваім ззяннем рассоўвае цемру, і побач – дрыжачы ад болю матыль. Прываблены «красой жывой», ён бязвольна кінуўся да агню і напаткаў у ім смерць. Праз спалучэнне ў творы вобразаў-антыподаў (краса і смерць) прыгажосць свечкі ўспрымаецца як халодная, абыякавая да ўсяго навокал. Жывое, што патрабуе ахвяр, нібыта пераўвасабляецца ў сваю супрацьлегласць і спараджае смерць. «Свяча гарыць. З яе ліецца / За кропляй кропля, як раса, / А матылёк ужо не б'ецца. / Табе ахвяра ён, краса! » [1, с. 125].

Матыў смерці часты ў паэтычных і празаічных творах М. Багдановіча: «Страцім-лебедзь», «Максім і Магдалена», «Не кувай ты, шэрая зязюля...», «Ян і маці», «Дзве смерці», «Плакала лета, зямлю пакідаючы...», «Самнамбул», «Колька», «Преступление» і інш., урэшце ім знітаваны цэлы «вянкоўскі» цыкл «Каханне і смерць». У свой час гэта дало падставу асобным крытыкам убачыць у творчасці пісьменніка выявы дэкадансу. Аднак смерць вельмі рэдка вітаецца ці эстэтызуецца М. Багдановічам. Такое прысутнічае, бадай, толькі ў рускамоўным апавяданні «Колька», герой якога – невылечна хворы трохгадовы хлопчык. У апошнія хвіліны свайго гаротнага, нават роднай маці непатрэбнага жыцця Колька бачыць «низко над собою голубой купол с золотыми звёздами <...> И путь из золотых лучей ведёт <...> куда-то в беспредельную высь, далеко, далеко. Там, наверху, с распростёртыми благословляющими руками стоит Тот, кого Колька видел на образе Воскресения в маленькой церкви, Кто шёл к нему теперь в сонме ангелов и Кто под видом яйца принёс ему вечность» [2, с. 23]. Вобраз «крошечного, с большой головой и тщедушным тельцем» [2, с. 21] дзіцяці з сацыяльных нізоў ніяк не стасуецца з паэтыкай сімвалістаў і з распаўсюджаным на пачатку мінулага стагоддзя, на так званым зломе эпох, у розных слаях грамадства адчуваннем «канца свету». Трактоўка смерці ў дадзеным выпадку выразна хрысціянская.

У чалавечым і прыродным свеце, па Багдановічу, прыгожае існуе толькі ў формах вечна рухомага і зменлівага жыцця («мілы тварык дзявочы», «Страцім-лебедзь – горды, моцны птах», «шпаркі, лёгкі сінякрылы матылёк» і г.д.), разам з тым, смерць у яго творах рэдка выступае супрацьлегласцю прыгожага і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

атаясамліваецца з катэгорыяй агіднага. Яна знішчае жывое, аднак, з ёй звязана нараджэнне, абнаўленне і адраджэнне. «Зразаюць галіны таполі адну за адной... / Без скаргі яны на зямлю чарадою лажацца, / Бо смерць іх патрэбна, каб дзерава новай вясной / Магло бы хутчэй развівацца» [1, с. 111]. У прыведзеных радках (адзначым, што яны не выяўляюць ідэю твора ў цэлым) паэт гаворыць пра сэнс існавання, пра такія высокія паняцці, як ахвярнасць і самаахвярнасць, дзякуючы чаму жыццё не перапыняецца і можа змяняцца да лепшага. Найбольш поўна пра гэта сведчыць змест і праблематыка цыкла «Каханне і смерць», у якім вобраз прадаўжальніцы чалавечага роду свядома трагедызуецца. Квінтэсэнцыяй усяго сказанага паэтам пра лёс маладой жанчыны – вагітнай, потым маці – з’яўляецца першая страфа васьмірадкоўя без назвы: «Смертию смерть поправ», / Ты ад жыцця адпачыла; / Ў муках памёрла сама, / Але дзіцё спарадзіла» [1, с. 164].

Заслугоўвае ўвагі яшчэ адна думка А. Луцкевіча, якая выявіла разуменне крытыкам сутнасці прыгожага ў дачыненні да творчасці: «...Маючы задачай быць «СПАЖЫТКАМ ДЗЕЛЯ ДУШЫ», даваць ЭСТЭТЫЧНУЮ ЭМОЦЫЮ і гэтым выклікаць у нас РОСТ ДУШЫ, – КРАСА НЕ МОЖА СЛУЖЫЦЬ ІНШЫМ БАГАМ <...> Грамадскія матывы, заклікі, ідэалы могуць складаць ЗМЕСТ мастацкага творства, могуць служыць магутным ПАБУДЖЭННЕМ да тварэння, але *не могуць дыктаваць сваіх законаў* КРАСЕ <...> ЧЫСТАЙ КРАСЕ, нікому і нічому не пакараючайся, з поўнай свядомасцяй служыў Максім Багдановіч» [5, с. 24]. Такім чынам, прыгожае (краса) выступае яшчэ і сімвалам свабоднай творчасці пісьменніка. Свабоднай ад усякага дыктату, ад усякіх сацыяльных, класавых, партыйных, часавых «заказаў». Галоўная яе мэта – абуджэнне і развіццё лепшых якасцей чалавечай душы.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.
3. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры ; уклад. і падрыхт. тэксту Т.С. Голуб. – Мінск, 1992.
4. Івашын, В. У пошуках красы і гармоніі / В. Івашын // Полымя. – 1993. – № 9.– С. 234–244.
5. Луцкевіч, А. Праблемы красы й мастацтва ў творах Максіма Багдановіча / А. Луцкевіч // Максім Багдановіч: вядомы і невядомы : зб. літаратуразн. і арх. матэрыялаў ; уклад. і камент. Ц.В. Чарнякевіча ; прадм. і гласарый Ю.В. Пацюпы. – Мінск, 2011. – С.16–24.
6. Чабан, Т. Космас «Вянка» / Т. Чабан // Поўны збор твораў : у 3 т / М. Багдановіч. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мінск, 1992. – С. 464–518.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ